# 14. У АБАРОНУ СВАЁЙ ЗЯМЛІ

Ледзяныя вятры з поўначы ды гарачыя з поўдня наганялі хмары на блакітныя нябёсы Полацкага княства. На нашы землі напалі **рыцары**-крыжакі. Яны рабавалі гарады і вёскі, забіралі людзей у палон. Супраць крыжацкай пагрозы разам выступілі многія славяне і балты. Балты — гэта продкі сучасных літоўцаў і латышоў. Так у **13 стагоддзі** беларускія і літоўскія землі аб'ядналіся ў адну дзяржаву — **Вялікае Княства Літоўскае**.



Крыжакі каля Навагрудскага замка

Правообладатель Издательский центр БГУ

Яго цэнтрам першапачаткова стаў горад Навагрудак.

Разгледзьце карту «Вялікае Княства Літоўскае» на с. 6—7 атласа. Пакажыце на ёй кірункі паходаў рыцараў-крыжакоў і першапачатковы цэнтр княства.

У 14—15 стагоддзях барацьбу супраць крыжакоў узначаліў вялікі князь **Вітаўт**, які стаяў на чале княства. З малых гадоў Вітаўт вучыўся трымаць у руках зброю, сядзець на кані. У далейшым гэта яму спатрэбілася. У гады яго кіравання дзяржава дасягнула сваёй найбольшай велічы і магутнасці.



Вялікі князь Вітаўт


Правообладатель Издательский центр БГУ

**У 1410 годзе** Вітаўт павёў свае войскі на нямецкіх рыцараў. Каля вёскі Грунвальд (што азначае «зялёны лес») Вітаўт сустрэўся са сваім братам, польскім каралём Ягайлам. Яны пачалі бой з крыжакамі. Праціўнікі сышліся ў жорсткай бітве. Трава пачырванела ад крыві. Іскры сыпаліся ад мячоў і шчытоў. Ламаліся коп'і. Параненыя воіны падалі пад капыты коней.

Бітва працягвалася ўвесь дзень. Пад вечар крыжакі не вытрымалі. Яны пачалі адыходзіць, а неўзабаве і пабеглі, ратуючыся ад пагібелі і палону. Дзякуючы мужнасці беларусаў, літоўцаў, палякаў і татараў крыжакі былі разбіты.

Шмат гадоў мінула з таго часу. Аднак і дагэтуль мы шануем мужных ваяроў, якія перамаглі ворагаў у цяжкай бітве пад Грунвальдам.

1. Як называлася новая дзяржава, у якую аб'ядналіся беларускія і літоўскія землі?
2. Які горад першапачаткова стаў цэнтрам новай дзяржавы?
3. Назавіце імя вялікага князя, які ўзначаліў барацьбу з рыцарамі-крыжакамі.
4. Якая бітва адбылася ў 1410 г.?
5. Чаму беларускія, літоўскія, польскія і татарскія воіны перамаглі ў бітве пад Грунвальдам?

Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Вызначце, якая дзяржава існавала раней: Полацкае княства ці Вялікае Княства Літоўскае.

**2.** Разгледзьце выяву Вітаўта на с. 58 вучэбнага дапаможніка. Што сведчыць аб яго пасадзе вялікага князя і ўдзеле ў бітвах?

Растлумачце, чаму рыцараў называлі крыжакамі. Выкарыстайце малюнак на с. 57 вучэбнага дапаможніка.

## 15. ПАД СЦЕНАМІ СТАРАЖЫТНЫХ ЗАМКАЎ

Нашы продкі будавалі за́мкі, каб абараніцца ад ворагаў. Слова «за́мак» падобнае да слова «замо́к». І сапраўды, старажытныя ўмацаванні можна назваць замка́мі. Адамкнуць іх або падабраць ключы ворагам удавалася не заўсёды.

Найбольш магутныя за́мкі ўзводзіліся на межах у самых небяспечных месцах. Першапачаткова замкі будавалі з дрэва, а потым — з каменю і цэглы. Яны з'явіліся ў Лідзе, Навагрудку, Крэве.

Кожны замак меў свае асаблівасці. У Навагрудскага замка было сем вежаў. Лідскі і Крэўскі — амаль блізняты. Яны мелі форму няправільных чатырохкутнікаў і па дзве вежы

 Правообладатель Издательский центр БГУ



Старажытны замак

ў вуглах. Таўшчыня сцен дасягала трох метраў, вышыня — 12 метраў, а даўжыня сцен складала 400—500 метраў. Замкі былі акружаны равамі з вадою.

Разгледзьце карту «Вялікае Княства Літоўскае» на с. 6—7 атласа. Пакажыце на ёй Навагрудскі замак.
Разгледзьце карту «Гістарычныя архітэктурныя помнікі Беларусі» на с. 8—9 атласа. Пакажыце на ёй, дзе размешчаны Лідскі замак і знаходзяцца рэшткі Крэўскага. Апішыце іх.

Правообладатель Издательский центр БГУ 

З Крэўскім замкам звязана наступнае паданне. Князь Ягайла жадаў быць адзіным гаспадаром. Ён падманам пасадзіў у падзямелле замка свайго брата — князя Вітаўта. Выратавацца з няволі Вітаўту дапамагла жонка, якая наведала яго разам са служкаю. У час сустрэчы ён пераапрануўся ў жаночае адзенне служкі і разам з жонкай пакінуў замак. Вітаўта сустрэлі верныя людзі, якія чакалі яго з асядланымі коньмі ва ўмоўленым месцы.

І вось князь Вітаўт імчыць прэч ад Крэўскага замка. Шлях прывёў яго ў лясную вёску непа-



Будаўніцтва Сынкавіцкай царквы-крэпасці

 Правообладатель Издательский центр БГУ

далёку ад Слоніма, дзе ён схаваўся ад пагоні. А пазней у гэтым месцы ў знак уратавання была пабудавана Сынкавіцкая царква-крэпасць. Яна з'яўлялася адначасова і храмам, і абарончым збудаваннем. Царква-крэпасць і дагэтуль зачароўвае людзей сваёй суровай прыгажосцю.

Разгледзьце карту «Гістарычныя архітэктурныя помнікі Беларусі» на с. 8—9 атласа. Пакажыце на ёй Сынкавіцкую царкву-крэпасць і дзе яна размешчана.

Па загадзе князя Вітаўта быў пабудаваны каменны замак у Гродне. Гродзенскі замак



Гродзенскі замак

меў вельмі цікавую канструкцыю моста. Замак быў істотна перабудаваны па загадзе караля **Рэчы Паспалітай.** Такую назву атрымала новая дзяржава. У яе ў **16 стагоддзі** аб’ядналіся Вялікае Княства Літоўскае і Польскае Каралеўства. У складзе гэтай дзяржавы знаходзіліся беларускія, украінскія, польскія і літоўскія землі.

У 16 стагоддзі былі пабудаваны замкі ў Міры, Нясвіжы, Гальшанах. Гальшанскі замак лічыўся адным з самых прыгожых. Казалі, падобны да яго ёсць толькі ў Францыі. Ён нечым нагадваў Мірскі замак, але выглядаў не так сурова. Гальшанскі замак захаваўся да нашых дзён у паўразбураным стане. Затое сёння аднаўлены Мірскі замак. У яго залах прадстаўлены ўзоры мэблі, калекцыі старажытнай зброі і даўніх музычных інструментаў. Ёсць там творы жывапісу і прадметы быту.

Самым багатым і прыгожым у Беларусі з’яўляецца Нясвіжскі замак. Ён належаў старажытнаму роду князёў **Радзівілаў.** Тут былі сабраны цікавыя калекцыі рыцарскай зброі, каштоўных камянёў, манет, абразоў і карцін. Бібліятэка замка змяшчала 20 тысяч кніг, розныя гістарычныя дакументы. Замак узведзены ўбаку ад горада, між азёр — фактычна на востраве.

Замкі — агульнанародны гонар, бо хоць яны і належалі князям, але ж ствараліся ўсім


Правообладатель Издательский центр БГУ

народам. У час навалы навакольныя жыхары ратаваліся ў замку, абаранялі яго, а значыць, і сваю зямлю.

Разгледзьце карту «Гістарычныя архітэктурныя помнікі Беларусі» на с. 8—9 атласа. Пакажыце на ёй, дзе знаходзяцца Гальшанскі, Мірскі, Нясвіжскі замкі. Апішыце гэтыя замкі.

## Карысна ведаць

Мірскі замкава-паркавы комплекс і архітэктурна-культурны комплекс Радзівілаў у Нясвіжы ўнесены ў спіс Сусветнай культурнай спадчыны. А сёння вы можаце ўбачыць, як яны выглядалі на малюнках 19 стагоддзя. Аўтарам гэтых замалёвак стаў таленавіты мастак **Напалеон Орда**. Праўда, цікавае імя?







Мастак Напалеон Орда і яго замалёўкі Нясвіжскага і Мірскага замкаў

Правообладатель Издательский центр БГУ

Вы, напэўна, чулі такое? Сам мастак нарадзіўся на Брэстчыне. Ён шмат падарожнічаў, а пасля сваіх вандровак пакінуў замалёўкі замкаў і палацаў, вёсак і гарадоў. Кожная культурная сям'я імкнулася мець у сябе альбом з такімі малюнкамі. Бо яны адлюстроўвалі найпрыгажэйшыя мясціны роднага краю. Мастак за сваё жыццё выдаў шэсць альбомаў. Сваёй творчасцю ён служыў Бацькаўшчыне.

1. Адкуль паходзіць назва *за́мак*?
2. Для чаго будаваліся замкі?
3. Што ўразіла вас у паданні аб выратаванні князя Вітаўта з падзямелля Крэўскага замка?
4. Чым знакамітыя Мірскі і Нясвіжскі замкі?
5. У 16 стагоддзі Вялікае Княства Літоўскае і Польскае каралеўства аб'ядналіся ў новую дзяржаву. Як яна называлася?

Параўнайце мінулы і сучасны выгляд Мірскага і Нясвіжскага замкаў. Выкарыстайце малюнкі Напалеона Орды на с. 65 вучэбнага дапаможніка.


Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Вызначце, чаму Гродзенскі замак меў незвычайную канструкцыю моста. Выкарыстайце малюнак на с. 63 вучэбнага дапаможніка.
2. Апішыце ўмовы жыцця ў старажытным замку. Выкарыстайце малюнак на с. 61 вучэбнага дапаможніка.
3. Апішыце, як будавалася Сынкавіцкая царква-крэпасць. Выкарыстайце малюнак на с. 62 вучэбнага дапаможніка.

## 16. ПА ЯКІХ ЗАКОНАХ ЖЫЛІ НАШЫ ПРОДКІ

У свеце існуюць розныя законы. Ёсць, напрыклад, законы прыроды. Сапраўды, чалавек не можа спыніць дождж ці снегапад. Нельга загадаць ветру не ламаць дрэвы і не разбураць дамы. Гэтыя законы незалежныя ад чалавека.

З цягам часу ў людзей з'явіліся свае законы. Яны былі заснаваны на правілах штодзённага жыцця. Напрыклад, вы і сёння ведаеце, што старэйшых трэба паважаць. Трэба любіць і шанаваць сваіх бацькоў, бабуль і дзядуляў, дапамагаць ім. Проста і зразумела, ці не так? А гэта і ёсць няпісаныя законы, якія выпрацавала само жыццё. Паводле такіх законаў паважалі тых людзей, якія сумленна працавалі і добра ставіліся да іншых.

Правообладатель Издательский центр БГУ